# СЕКЦИЯ 3
## СУДЬБА ЧЕЛОВЕКА В СУДЬБЕ РОДНОЙ БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

**Л.У. Ветрава**
*(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт,
г. Брэст, Беларусь)*

### “З ЛЮБОЎ’Ю І МІРАМ ДА ВАС…”: ЛІРЫКА НАДЗЕІ МІКАЛАЕЎНЫ ПАРЧУК

Берасцейская зямля багатая на імёны знакамітых сучасных пісьменнікаў: Зінаіда Дудзюк, Лявон Валасюк, Зніч (Алег Бембель), Галіна Тварановіч і многія іншыя. Іх паэзія шматпланавая. Разнастайная тэматыка вершаў задавальняе сучасных чытачоў. Сёння, гартаючы старонкі газет і часопісаў, можна ўбачыць імёны паэтаў XXI стагоддзя. Напрыклад, у газеце “Заря” друкуюцца шматлікія вершаваныя творы Брэсцкіх паэтаў. Гэта і Ірына Морых, і Святлана Валуй, і Лявон Валасюк, Таццяна Шульга і Марына Шадуя, Марыя Суліма і Людміла Пятрова, Уладзімір Лебедзеў, Вольга Роліч, Аляксандр Дзямко, Марыя Ражнова і многія іншыя. Іх рознабаковая паэзія, разнастайная тэматыка не дазваляе чытачу сумаваць. Менавіта праз газету “Заря” я ўпершыню пазнаёмілася з вершамі не меньш таленавітай паэткі Надзеі Парчук. У краязнаўчым аддзеле Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага я даведалася, што Надзея Парчук на сённяшні дзень выдала восем зборнікаў вершаў: “Жыццёвыя плыні” (2003), “Я сердце людям подарю” (2004), “Ладараж” (2006), “Раскрыліўся бусел над хатай” (2009), “Зарунее жыта зноў…” (2010), “Берагі Надзеі” (2014), “Венерын чаравічак” (2015), “Святло няскончанай душы” (2017). Як бачым, Надзея Парчук піша вершы на беларускай і рускай мовах.



Надзея Мікалаеўна Парчук нарадзілася 27 верасня 1951 года ў в. Ладараж Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння дзесяцігодкі яна паспяхова пастутпае ў Пінскі ўлікова-крэдытны тэхнікум (банкаўскі каледж). Атрымаўшы спецыяльнасць бухгалтара зберагальных кас, Надзея Мікалаеўна 25 гадоў свайго жыцця прысвяціла служэнню банкаўскай сістэме, працуя кантралёрам-касірам ў Ладожскай зберагальнай касе.

Дзякуючы набыўшым ведам, дабрасумленным адносінам да сваёй працы, прыроджаным дабраце і чуласці сэрца, яна хутка заслугоўвае сябе аўтарытэт і давер з боку адміністрацыі, калег, павагу і ўдзячнасць сваіх кліентаў, набывае любоў і падтрымку землякоў і тутэйшага кіраўніцтва. І ўсяго гэтага Надзея дасягнула, пакараючы штодзень з ранняга дзіцячага веку свой лёс, сваю найсур’ёзнейшую перашкоду ў жыцці – інваліднасць з парушэннем апорна-рухальнага апарата.

На сённяшні час Надзея Парчук ужо не працуе. Па стане здароўя яна датэрмінова пайшла на заслужаны адпачынак. Аднак гэты мужны і нястомны чалавек-працаўнік, звыклы аддаваць усю сваю моц на карысць людзям, знайшоў спосаб заставацца карысным грамадству і надалей.

Як living рознабаковая, разважная, а галоўнае, творча таленавітая і тонка адчуваючая асоба, яна лёгка ўвайшла ў адзін з найпрыгажэйшых відаў літаратуры – паэзію, любоў да якой можна было заўважыць у дзяўчыны яшчэ з ранняга ўзросту, назіраючы, з якім зачараваннем ўслухоўвалася яна ў мелодыі старадаўніх песен, якія выконвала яе бабуля, матуля, тата, сваякі.

Услухоўвалася, захаплялася, убірала, запамінала і… марыла ствараць і сваю сапраўды такую ж хвалюючую, захапляльную дух, прыгожую песню або верш.

Першую спробу будучая паэтка зрабіла яшчэ ў трэцім класе, прачытаўшы свой вершык толькі матуле. Зразумела, што ян атрымаўся па-дзіцячы наіўным, кароткім… А зараз яе творы чытаюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Эстоніі, Украіне і ў іншых краінах. У апошні час Надзея стала плённа займацца вершаваннем радкоў. Яе вершы друкуюцца ў такіх перыядычных выданнях, як “Заря”, “Настаўніцкая газета”, “Літаратура і мастацтва”, “Голас Радзімы”, “Наша доля”, “Преображение”, а таксама ў часопісах “Надежда”, “Акно”, “Белые снегири”. Першы зборнік яе вершаў “Жыццёвыя плыні” выйшаў у марце 2003 г. на беларускай мове.

Творчасць паэтэсы прыцягвае да сябе аматараў прыгожага чароўнага пісьменства сваёй сардэчнасцю, шчырасцю, прыгажосцю пачуццяў, унутранай эмацыйнасцю, прастатой і дакладнасцю выразаў, лёгкасцю ўзлёту яе душы. Гартаючы зборнікі яе вершаў, здзіўляешся, колькі ж змясцілася любові, дабрыні, душэўнай прыгажосці і таленту ў адным чалавеку, ў адным сэрцы! Творчасць Надзеі Парчук прасякнута роздумам над праблемамі жыцця, лёсам чалавека ў Вечнасці, любоўю да роднай зямлі, хрысціянскімі матывамі. Яе вершы, як і яна сама – светлыя, узнёслыя, лёгкія і глыбокія, але глыбокія такой яснай, чыстай глыбінёй.




Уся лірыка Н.М. Парчук падзяляецца на дзве плыні: хрысціянская і патрыятычная. Да хрысціянскай лірыкі адносяцца такія вершы, як: “Не плач, чалавек прад бядою”, “Я не стварыла мудрага нічога”, “Малюся ўдзень я і ўначы”; “Навучы Божа!” і інш; да патрыятычнай лірыкі адносяцца: “Бацькаўшчына”, “Старонка мая дарагая”, “Дарагая Радзіма… Айчына…”, “Раніцай”, “Вясновы настрой” і інш. Адданай любові да Радзімы і высокага патрыятызму ў паэткі не адабраць. Хочацца з гонарам паўтараць яе ўрачыстыя радкі:

Дарагая Радзіма… Айчына…
Як цябе мне яшчэ ўшанаваць?
Ты ж на ўсім белым свеце адзіна
Гэтак здольна любіць, спачуваць.
…

Я і зноў на ўвесь дзень атрымаю
Ад цябе жыватворны зарад.
Ты адзіная ў свеце такая –
Як матуля, як бацька, як брат… [2, с. 20].

Лірычны герой Н. Парчук трывожыцца за лёс сваёй бацькаўшчыны, нясе адказнасць за яе будучае. У вершы адчуваецца гонар, любоў да Радзімы і абавязак бараніць яе, а таксама выклікае пачуццё нацыянальнай годнасці і свабадалюбства.

Старонка мая дарагая!
Ўсё клчаш-завеш да сябе –
Я гэта штодня адчуваю,
І ў шчасці сваім, і ў журбе.

Я чую твой гоман здалёку,
А ён мне такі дарагі!
Бо я ж з гэтых самых вытокаў,
Адны ў нас з табой берагі.

Твой голас пяшчотна-лагодны,
Казала і зноўку скажу,
Што ён мне – найлюбы і родны –
Натхняе і гоіць душу.

Што мне без яго гэтак сумна,
Як птушцы ў краінах чужых,
І я, замаўкаючы думна,
Малюся за продкаў сваіх [2, с. 5].

У вершы адчуваецца, што аўтар сумуе па сваёй Радзіме. Усім сэрцам адчувае боль і плач душы чалавека, які ў мроях рвецца да сваёй бацькаўшчыны.

Лірыка паэта глыбока псіхалагічная, прасякнута пачуццямі смутку, тугі па радзіме, якая ўсё аддаляецца. Гэтым вершам аўтар хоча, хаця б у думках, аднавіць для сябе той свет, які застаўся на Радзіме.

У вершы “Раніцай” Н. Парчук паэтызавала месца свайго дзяцінства, любы і дарагі вобраз мілай старонкі – невычэрпнай крыніцы душэўнай радасці, дабра, прыгажосці:

Расчыню дзверы раніцай роснай,
Як калісьці ў дзяцінстве, шырэй, -
Патану ў прыгажосці дзівоснай
І ад радасці стану дабрэй.

Павітаюся шчыранька з сонцам –
Ажно слёзы ў вачах заблішчаць…
“Ах, як люба мне ў мілай старонцы!” –
Зноўку словы ў блакіт паляцяць [1, с. 10].

Радзіма, яе прырода і гісторыя края, хвалявалі і працягваюць хваляваць паэта.

Усе вершы патрыятычнага кшталту, напоўненыя водарам роднага краю, уласным роздумам і спадзяваннямі аўтара, новымі ўражаннямі і сустрэчамі, памяццю пра бацькоў і Беларусь.

Вялікае значэнне ў вершах Надзеі Парчук адыгрывае і свет навакольнай прыроды.Так, напрыклад у вершы "Вясновы настрой" паэтэса ўражана і зачаравана хараством вясновага асяроддзя! Яна захапляецца прыгажосцю сонца, зоркамі, травамі, нябёсамі, аблокамі. Прыгажосць, быццам, закалыхала яе.

Добрай раніцы, сонца вясновае!
І бывайце да вечара, зоркі!
Не хавайцеся ў хмаркі вы толькі,
Як расіца асядзе на зёлкі
І на першыя травы шаўковыя.

Дык заплюшчвайце вочкі санлівыя –
Вашых сноў аніхто не парушыць.
Сонца мокрыя травы асушыць,
І касцы іх закосяць шчаслівыя.

Спачывайце пакуль, мае мілыя, -
Я пагутару з сонцам высокім
Пра нябёсы яго і аблокі,
І пра мары свае белакрылыя [1, с. 11].

У зборнік "Берагі надзеі" увайшлі лірычныя, глыбока філасофскія вершы. Паэтка разважае над такімі філасофскімі паняццямі, як любоў, душа, жыццё, вера, мудрасць, вечнасць, надзея і інш. Можна сказаць, што паэтка ва ўсёй сваёй паэзіі праявіла сябе як філосаф. Яе паэзія мае тэндэнцыю збліжэння з філасофіяй, імкнецца праз слова выявіць markdown розабаковыя з'явы рэчаіснасці, найглыбейшыя праявы псіхалогіі чалавека. Гэтым можна сказаць, што паэтка з'яўляецца ўдумлівым псіхолагам. Яе вершы – гэта пераважна філасофскі маналог, які імкнецца ўзбуйняць пачуцці, лірызаваць іх.

Усе вершы Надзеі Парчук складаюць вялікі маналог-роздум аб вышэйназваных філасофскіх праблемах. Паэт, як тонкі лірык, разважае над складанымі праблемамі жыцця.

Тэматыка твораў агульначалавечая. У вершы "Не плач, чалавек, прад бядою" аўтар звяртаецца да чалавечай мудрасці. Мудрасць для яе склала гармонію душы. Верш пачынаецца з закліка:

Не плач, чалавек, прад бядою –
Хіба ж ты адзіны такі?
Святой прычасціся вадою,
Прарочыя ўспомні радкі… [2, с. 37].

Хрысціянскія матывы твораў як бы падпарадкоўваюць пачуцці розуму, розум – творца гармоніі, панаванне асобы над страсцямі спазнае божы запавет. У сваіх вершах паэтка дае адказ на вечнае пытанне "Чаго мы ў гэты белы свет прыйшлі". Аўтар падказвае, што адказ на гэтае пытанне можна атрымаць, звярнуўшыся да Бібліі:

Не трэба філасофстваваць замнога,
Чаго мы ў гэты белы свет прыйшлі.
Душа твая належыць толькі Богу,
Ну а жыццё ўсім людзям на зямлі.

Аўтар разважае, што жыццё не вечнае, і пакуль мы жывыя – трэба аддаваць сябе і сваю любоў людзям, дарагім сэрцу, каханым:

А сэрца ты аддай сваёй каханай,
Любоў да кроплі любай падары,
А прыйдзе час – твая душа-падранак
Навек сальецца з полымем зары…

І калі што ў жыцці не зразумела,
У Кнізе кніг шукай на ўсё адказ.
Тады прад Небам ты паўстанеш смела,
Бо там за ўсё спытаюць – прыйдзе час [2, с. 46].

Лірычны герой верша "Я не стварыла мудрага нічога…" асэнсоўваюцца такія вечныя паняцці, як "мудрасць", "ісціна", "святыня". Аўтарка верыць, што чалавекуіх можна дасягнуць толькі праз імкненне душы да Бога. Лірычнаму герою верша ўласцівая такая беларуская рыса, як набожнасць. Аўтар верыць у збавенне, у тое, што за грахі людскія адпакутаваў на крыжы Ісус Хрыстос.

Я не стварыла мудрага нічога,
Я патанула ў мудрасці чужой –
Той, што даецца выбраным ад Бога
І чалавецтвам лічыцца святой.

Але й за гэта лёсу вельмі ўдзячна,
Бо мне магчымасць дадзена была –
Душой крануцца ісцін самых значных
І прычасціцца промнямі святла…[1, с. 44].

Сваімі вершамі Н. Парчук падказвае, што прызванне чалавека на зямлі – тварыць дабро. У дабра шмат назваў: філантропія, любоў да бліжняга, братэрства, прыхільнасць, чалавечнасць, спачуванне, суперажыванне, дапамога, міласэрнасць, пяшчота, пачуццё дабра, патрыятызм. Лірычны герой верша "Навучы Божа!" адкрывае перад намі сябе, сваё ўнутранае жыццё, сваю духоўную напоўненасць. Лірычны герой хоча выявіць сваю індывідуальную асобу, сваё існаванне. Лірычны герой Н. Парчук – асоба, якая хоча быць чалавекам па прызнанні.

Малюся ўдзень я і ўначы,
Бо без малітвы веру згубіш:
О Божа мілы, навучы
Любіць людзей, як Ты іх любіш!

І падкажы, дзе сілы ўзяць,
Каб не займець шыпоў, бы ў ружах?
Якія словы ім сказаць,
Каб запаліць святло ў іх душах?
Бо словы мудрыя заўжды
Гартуюць нашы сілы духу,
Прыносяць добрыя плады
У гэтым вечным жыццяруху [2, с. 54].



Вершы Надзеі Парчук хрысціянскага кірунку ўплываюць на душу чытача, устанаўліваюць гармонію ў душы, ачышчаюць яе ад страху, зайздрасці і жорсткасці. Хрысціянская лірыка ўплавае на фарміраванне свядомага выратавання душы людзей, яна нясе ў сабе знак хрысціянскай любові, бескарыснасці і ахвярнасці. Лірыка гэтага кірунку забяспечвае гарманічнае існаванне чалавека пры яго далейшым развіцці, не прыводзячы да вялікіх страт.

У артыкуле прааналізаваны выбраныя вершы любоўнай, хрысціянскай і патрыятычнай лірыкі паэтычнай асобы выбраных вершаў, зборнікаў “Берагі надзеі” і “Ладараж”. У выніку адзначана, што духоўныя пошукі лірычнай гераіні спраецыраваны на рэальнае жыццё і яго актуальныя праблемы. Ключавыя ў яе хрысціянскай паэзіі матывы балеснага хвалявання за людзей, самакрытыкі, самапрыніжэння, стрыманасці, удасканалення, узвышэння. Духоўны свет яе лірычнай гераіні арганічны, living рознабаковы, асветлены глыбока хрысціянскімі ідэямі багавейнай пакоры перад няўмольнымі цяжкасцямі лёсу, памнажэння дабра для наступных пакаленняў, штохвілiннай аптымістычнай памкнёнасці.

Патрыятычная лірыка Надзеі Парчук абуджае ў чытача любоў да прыроды, любоў да жыцця. Вершы Надзеі Парчук прасякнуты пачуццём патрыятызму і самаахвярнасці, якое праяўляецца з велізарнай сілай.

**Літаратура**


1. Парчук, Н. М. Ладараж : вершы / Надзея Парчук. – Брэст : ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2006. – 104 с.
2. Парчук, Н. М. Берагі надзеі : зборнік паэзіі / Надзея Парчук. – Брэст : Альтернатіва, 2014. – 160 с.
3. Парчук, Н. Н. Я сердце людям подарю. Сборник стихов. – Брест : ОАО “Брестская типография”, 2004. – 156 с.